**Выдавец:**
Прыватнае прадпрыемства
«Дарога на Вільню плюс»,
пасв. №391053932, выд. 12.10. 2009 г. Глыбоцкім РВК.
Перыядычнасць – 1 раз на тыдзень, дзень выхаду – чацвер,
выдаецца на беларускай мове.

Штотыднёвая газета

# Вольнае Глыбокае

vglybokaye@tut.by

Выдаецца са снежня 1994 года | 5 (513) 4 лютага 2010 года | Кошт **свабодны**

Шматлюдна на катку каля гарадскога Дома культуры.

*Фота Ул. Срабатуна*



Вы можаце падаць сваю прыватную абвестку і па **хатняму** тэлефону на нумар 166. **Кругласутачна.** Выразна назавіце назоў газеты. У дадзеным выпадку – "Вольнае Глыбокае".

Кошт абвесткі аб'ёмам да 5 слоў – 2500 рублёў. Кожнае далейшае дадатковае слова – 300 рублёў.

Абвестка тлустым шрыфтом да 5 слоў – 3000 рублёў. Кожнае далейшае дадатковае слова – 400 рублёў.

Між тым, парадак прыёму прыватных абвестак у месяцах продажу нашай газеты – нязменны.

## ²íñïåêöûÿ Âåðõíÿäçâ³íñêàãà ìàñëàñûðçàâîäà ýêñïåðòàì³ ÅÑ çàâåðøàíà ïàñïÿõîâà

*Алесь Сьнег*

**Чарговая інспекцыя Верхнядзвінскага маласырзавода і сельгаспрадпрыемстваў раёна, якія пастаўляюць яму сыравіну, экспертамі ЕС завершана паспяхова, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Эдуард Дзям’янаў.**

«Місія завершана дадатна», - працытаваў Эдуард Дзям’янаў заяву афіцыйных прадстаўнікоў экспертнай групы. Пісьмовыя вынікі інспекцыі будуць дадзены на працягу месяца - такая працэдура.

Па меркаванні Эдуарда Дзем’янава, пасля такой заявы верхнядзвінскія прадпрыемствы могуць разлічваць на пацверджанне адпаведнасці якасці сваёй прадукцыі высокім патрабаваннямветэрынарнай бяспекі, што дасць ім магчымасць пашырыць рынкі збыту ў Еўропу.

Як паведамлялася раней, Беларусь ужо прайшла некалькі этапаў, неабходных для атрымання права на пастаўкі малочнай прадукцыі ў ЕС. У прыватнасці, Верхнядзвінскі маласырзавод першым у Беларусі атрымаў сертыфікат адпаведнасці сістэме мэнэджменту якасці LST EN ISO 9001:2008 і бяспекі харчовых прадуктаў LST EN ISO 22000:2005.

**Фота** Юліі Дарашкевіч

## Áåëòýëåðàäû¸êàìïàí³ÿ àáâÿñö³ëà ïðà ïà÷àòàê íàöûÿíàëüíàãà àäáîðó âûêàíà¢öû äëÿ ¢äçåëó ¢ êîíêóðñå «Å¢ðàáà÷àííå-2010»

*Таццяна Дарашчонак, БелаПАН.*

**29 студзеня Белтэлерадыёкампанія абʼявіла аб пачатку нацыянальнага адбору афіцыйнага прадстаўніка Беларусі для ўдзелу ў конкурсе песні «Еўрабачанне-2010», які ў канцы мая пройдзе ў Осла (Нарвегія).**

Арганізатарам адборачнага тура з’яўляецца Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія. Адбор праводзіцца ў адпаведнасці з палажэннем, распрацаваным арганізатарам, і правіламі конкурсу, устаноўленымі Еўрапейскім вяшчальным саюзам.

Як паведамляе прэсслужба Белтэлерадыёкампаніі, удзел у адборы могуць браць асобы, якім на 24 мая 2010 года будзе не менш чым 16 гадоў, грамадзянства не мае значэння. Прэтэндэнт можа выконваць песню працягласцю тры хвіліны, якая да 1 кастрычніка 2009 года не была камерцыйна рэалізаваная, абнародавана або публічна выканана. Песня можа быць прадстаўлена максімум шасцю выканаўцамі.

Прэтэндэнтам да 15 лютага варта каштоўнай бандэроллю дасласць заяўку з пазнакай «Конкурс песні «Еўрабачанне-2010» на адрас Белтэлерадыёкампаніі (220807, Мінск, вул. Макаёнка, 9). Палажэнне аб правядзенні нацыянальнага адбору «Еўрабачання-2010» і форма заяўкі апублікаваныя на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by (раздзел «Праекты»).

Для ацэнкі прэтэндэнтаў, якія падалі заяўкі, будзе створана фокус-група, якая абярэ і абʼявіць прадстаўніка Беларусі на «Еўрабачанні-2010» не пазней за 10 сакавіка. Апрача таго, будзе выбраны рэзервовы выканаўца. Рашэнне аб замене прымае арганізатар у выключных выпадках.

Усе правы, што адносяцца да правядзення адбору, належаць выключна арганізатару Белтэлерадыёкампаніі. Прамую трансляцыю міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010» з Осла будзе весці Першы канал.

Летась прадстаўніку Беларусі на «Еўрабачанні» Пятру Ялфімаву не ўдалося выйсці ў фінал. Лепшы вынік на гэтым конкурсе паказаў у 2007 годзе Дзмітрый Калдун, якому ўдалося заняць шостае месца ў фінале.

Ïàñòà¢ñê³ ðà¸í

# ×ûì ïðûâàá³öü ïàêóïí³êà

*Кастусь Александровіч*

**Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі за спажыўца ў перыяд эканамічных цяжкасцей прыходзіцца цяпер працаваць работнікам гандлю.**

Нягледзячы на гэта, як і раней паспяхова працуе адзін з лепшых у краіне, калектыў Пастаўскага райпо. У ягоным адным супермаркеце “Цэнтральны” летась прадалі тавараў больш чым на 7 млрд. рублёў, а пакупнікоў з дысконтнымі электроннымі карткамі стала ўжо больш 900. Сярод іх прайшоў чарговы конкурс, самым актыўным, каля 20 чалавек, уручылі каштоўныя падарункі, а за год праз гандлёвую залу прайшло больш мільёна пакупнікоў. Каб такога дабіцца, тут і ў іншых гандлёвых кропках смела прымяняюць нестандартныя хады, розныя акцыі і сістэмы скідак. Дзейнічае ўжо 38 фірменных секцый, выставы-дэгустацыі прадукцыі сталі праводзіцца і ў гандлёвых цэнтрах на вёсцы. Добры плён прынесла змяншэнне гандлёвых надбавак і тое, што асартымент тавараў значна пашырыўся. Акрамя райцэнтра сучасныя аб’екты гандлю ёсць цяпер у Камаях, Дунілавічах, Варапаеве, Андронах, Парыжы і тавараабарот там вырас у разы. Ды і як людзям было не купіць тавар, калі паўсюдна пад час святаў яго прапаноўвалі прадаўцы ў форме Дзедаў Марозаў і Снягурак.

Ì¸ðñê³ ðà¸í

# Íå ðàäóå òàê³ ñòàòóñ

*Чэслаў Якубовіч*

**На фоне многіх пазітыўных змен у глыбінцы існуючае становішча самага малога горада ў Беларусі Дзісны, што ў Мёрскім раёне, засмучае большасць яго жыхароў.**

З-за свайго статуса горада раённага падпарадкавання тут, у адрозненне ад іншых гарпасёлкаў, нават аграгарадок нельга было абуладкаваць. Другі такі былы райцэнтр вобласці Бягомль летась сур’ёзна папрыгажэў, а вось сродкаў выканаць рашэнне аблвыканкама па развіццю Дзісны з-за крызіса і адсутнасці фінансаў проста не хапіла. Яшчэ раней не атрымалася, як абяцалі на выбарах, “запусціць заводы”. У гэтым прыгожым месцы, на беразе Заходняй Дзвіны, адзін за адным былі ліквідаваны кансервавы, малочны заводы, хлебапякарня, закрылі дрэваапрацоўчы цэх лясгаса, камбінат будматэрыялаў, КБА, былую бальніцу, большасць магазінаў. Тут сапраўдныя фільмы жахаў можна здымаць сярод развалін пустуючых і закінутых будынкаў. Цяжка разлічваць і на прыток турыстаў, хоць некалькі аграсядзіб у маленькім гарадку пачалі сваю дзейнасць. Адно спадзяванне ў дзісненцаў, што кіраўніцтва Віцебскай вобласці зверне пільную ўвагу на існуючыя праблемы і давядзе да ладу намечаную праграму адраджэння старажытнага паселішча, якое катастрафічна адстала ў сваім развіцці ў параўнанні нават з райцэнтрам Мёры.

Ãëûáîöê³ ðà¸í

# Ïðûâ³ä «Ìàëî÷íàé âàéíû»

*Станіслаў Раманчук*

**Новы Мытны саюз не зменшыў, як чакалася, расійска-беларускіх супярэчнасцей у пытанях паставак нафты, газу, энергатранзіту і іншых, ад чаго церпяць канкрэтныя вытворцы.**

У ліку іх апынуўся буйны Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат, чые магутнасці разлічаны на перапрацоўку тысячы тон малака ў суткі. У далёкім Краснаярску напрыканцы студзеня ў шасці партыях яго згушчонкі былі знойдзены раптам неістотныя перавышэнні мікраарганізмаў. У выніку дырэктар камбіната тэрмінова вылецеў у Расію, каб урэгуляваць нечакана ўзнікшую праблему. На перамовах з партнёрам расійскай кампаніяй “Юнімілк” глыбачане вырашылі 274 тоны прадукцыі вярнуць дамоў і правесці дадатковыя аналізы. Ніякіх шкодных для здароўя спажыўцоў рэчываў у прадукцыі МКК быць не можа, як і ніколі раней такіх праблем не ўзнікала. Спецыялісты бачаць у прэтэнзіях Расельгаснагляду да беларускіх малочных заводаў відавочны палітычны падтэкст. Перад гэтым шэраг вядучых прадпрыемстваў малочнай галіны Беларусі руская паставілі пад рэжым узмоцненага кантролю. Ды і “почырк” да болю вядомы: раней ім не “падабаліся” якаснае віно Малдовы, грузінская мінералка “Баржомі”, украінскае сала і мяса з Польшчы.

Íàäâîð'å ¢ Ãëûáîê³ì www.rp5.ru

| Мясцовы час | чацвер 04.02.10 | | | | пятн.05.02.10 | | | суб. 06.02.10 | | нядз.07.02.10 | | пн 08.02. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 02:00 | 08:00 | 14:00 | 20:00 | 02:00 | 08:00 | 14:00 | 02:00 | 14:00 | 02:00 | 14:00 | 02:00 | 14:00 |
| Хмарнасць | | | | | | | | | | | | | |
| Ападкі | | * | * | * | | | * | * | | | - | - | - |
| Тэмпература, °С | -7 | -9 | -7 | -8 | -9 | -12 | -7 | -6 | -8 | -17 | -14 | -19 | -12 |
| Ціск, мм | 750 | 750 | 752 | 754 | 755 | 756 | 757 | 758 | 758 | 759 | 760 | 758 | 754 |
| Вільготнасць, % | 93 | 92 | 91 | 91 | 100 | 98 | 91 | 93 | 81 | 85 | 77 | - | - |
| Вецер м/сек | Ю-В 5 | В 2 | Ю-В 2 | Ю-В 1 | Ю-В 2 | В 2 | В 4 | Ю-В 4 | В 4 | В 3 | В 3 | Ю-В 2 | Ю-В 3 |

## Äçåíü çà äíåì

**У новым стагоддзі колькасць насельніцтва Беларусі, паводле папярэдніх дадзеных перапісу, скарацілася на працягу 10 апошніх гадоў яшчэ на 556 тысяч. Паўсюдна ідзе працэс вымірання вёсак (памерла амаль 650 тысяч сялян), малых гарадоў і толькі ў беларускай сталіцы народу прыбавілася на 148 тысяч жыхароў. Аднак захавалася тэндэнцыя колькаснай перавагі жанчын, бо на тысячу мужчын прыпадае цяпер 1145 прадстаўніц цудоўнай паловы чалавецтва.**

## Âàæíåéøûÿ íàâ³íû ñâåòó

***Венесуэла.*** З-за дэвальвацыі нацыянальнай валюты краіна апынулася на мяжы вострага крызіса, тут ужо пачаліся веерныя адключэнні электраэнергіі, прыпынілі кабельнае ТБ.

***Іран.*** Кіраўніцтва краіны паабяцала да чарговай гадавіны ісламскай рэвалюцыі давесці ў лютым працэс абагачэння ўрану да ўзроўню 20 %, што ўстрывожыла ўвесь свет.

***Гватэмала.*** Паліцыя краіны выдала ордэр на арышт былога прэзідэнта Альфонса Парцілла па абвінавачванню ў выкраданні і адмыванні 1 млрд. USD сродкаў бюджэту.

***Афганістан.*** У адной з бяднейшых краін свету з-за недахопу сродкаў парламенцкія выбары перанеслі на 4 месяцы, на 18 верасня, у ёй талібы вядуць узброеную барацьбу.

***Польшча.*** Актывы пенсійных фондаў краіны дасягнулі 54 млрд. USD і ў 14 разоў перавысілі адпаведныя накапленні беларусаў, Варшаўская біржа адзін з лідэраў у ЕС.

***Японія.*** Карпарацыя Panasonic першай у свеце пачынае выраб першага свайго мільёна тэлевізараў новага фармату вяшчання 3Д з аб'ёмнай трохмернай карцінкай і звычайнай.

***Англія.*** З красавіка ва ўсіх барах і начных клубах краіны забаранілі ўсе конкурсы выпівак і іншыя акцыі, уключаючы бясплатныя напоі жанчынам, каб людзі меней тут выпівалі.

***Францыя.*** У другі раз за апошнія 3 гады быў абрабаваны плавільны завод драгметалаў паблізу Ліёна, адкуль чацвёра узброеных злачынцаў вынеслі з сабой 100 кг золата.

***Расія.*** Расійская кампанія "Бізон" на базе МТЗ-80 "Беларусь" стварыла самы хуткі ў свеце супертрактар, які мае хуткасць больш 100 км/г і будзе ўдзельнічаць нават у гонках.

***Германія.*** Суд горада Кёльна прыгаварыў домакіраўніка да штрафу ў суме 5000 EUR за адмову здаць свабодную кватэру чорнаскурай пары і маральную дыскрымінацыю людзей.

***Мексіка.*** Толькі з дапамогай арміі спынілі масавыя хваляванні ў адной з турмаў строгага рэжыму, аднак у бойцы банд загінула больш 20 і яшчэ больш вязняў атрымалі раненні.

***Польшча.*** Сапраўдную паніку сярод палякаў выклікаў даволі моцны землятрус у раёне горнага горада Белхатув сілай 4,5 балы па шкале Рыхтара з-за рэкордных маразоў.

***Кітай.*** Суд правінцыі Сычуань вырашыў спагнаць штраф у суме 12 тыс. USD з двух поп-спявачак, якія на канцэрце спявалі пад фанаграму, якія ў КНР забаронены з 2008 года.

***Украіна.*** Розны рэзананс у грамадстве выклікаў указ кіраўніка краіны В. Юшчанкі аб прысваенні звання Героя Украіны (пасмяротна) барацьбіту за незалежнасць С. Бандэру.

***Расія.*** Мерай у адказ на размяшчэнне ў Польшчы ракет Patriot можа стаць пераўзбраенне Балтыйскага флоту за кошт аналагічных высокадакладных комплексаў "Іскандэр".

## Ïàäçå³, ïðà ÿê³ÿ ãàâîðûöü Áåëàðóñü

***Мінск.*** З новай ініцыятывай выступіў кіраўнік Пастаяннай камісіі беларускага парламента У. Здановіч прызываць на службу ў армію і ўсіх студэнтаў платнай формы навучання.

***Мінск.*** Праваабарончая арганізацыя Freedom House зноў аднесла Беларусь да ліку найбольш несвабодных краін свету сярод іншых 47 дзяржаў у катэгорыі правоў людзей.

***Магілёў.*** На рэкламных шчытах у горадзе вырашылі вывешваць партрэты злосных неплацельшчыкаў за камунальныя паслугі, такіх даўгоў назапасілася на 2,5 млрд. рублёў.

***Астравец.*** Паралельна з будаўніцтвам Беларускай АЭС вырашана ўзвесці і станцыю цвёрдых камунальных адходаў, палігоны іх уцілізацыі і аб'екты перапрацоўкі смецця.

***Мінск.*** Зноў па краіне пакуль у сярэднім на 2 % павысіліся цэны на бензін і дазпаліва на АЗС, з-за павышэння мытных пошлін у Беларусь увезлі з пачатку года каля 100 машын.

***Брэст.*** Надзвычай моцныя маразы ніжэй 30 градусаў па Цэльсію сталі прычынай дадатковых школьных канікул адразу ў 28 школах вобласці, такога холаду не было 20 год.

***Ліда.*** Следчыя КДБ пачалі крымінальную справу супраць кіраўніцтва аб'яднання "Лідахлебапрадукт" за махінацыі пры закупцы збожжа пасля выканання ім дзяржзаказу.

***Мінск.*** За распіццё піва і слабаалкагольных напояў на вуліцах і ў грамадскіх месцах у Беларусі з 23 лютага ўводзяць штрафы да 8 базавых велічынь, альбо каля 100 USD.

***Рагачоў.*** З-за моцных маразоў і аварыі на цэнтральным вадаправодзе без вады на працягу дня заставался палова горада і райбальніца, куды прыйшлося яе вазіць спецтэхнікай.

***Мінск.*** Каля 7 тысяч гатовых машын заставаліся без рэалізацыі на складах і пляцоўках сталічнага МАЗа, іх продаж на асноўным рынку Расіі ўпаў за год у 8,5 разоў да 1500 штук.

***Гомель.*** Каля грота палаца Румянцавых і Паскевічаў прайшла выстава 20 ледзяных скульптур Руслана Ярохава, а ў Мінску адбыўся гарадскі конкурс кампазіцый з лёду.

***Гродна.*** Да вялікай паводкі ў сувязі з моцнымі снегападамі пачалі рыхтаваць Гродзенскую ГЭС, якая будуецца на Нёмане, рэкорднае разводдзе сёлета чакаецца па ўсёй Беларусі.

***Мінск.*** У сістэме Міністэрства аховы здароўя Беларусі цяпер не хапае 4 тыс. урачоў і 5 тыс. медсясцёр, асабліва ў паліклініках,амбулаторыях, бо заробкі мізер, а працы шмат.

***Нясвіж.*** Навуковая рада пры Міністэрстве культуры Беларусі вырашыла прыбраць з замка Радзівілаў ганебны купал "цыбуліну", замяніць яго нармальнай старажытнай вежай.

***Мінск.*** На 7 сакавіка ў спорткомплексе "Мінск-Арэна", дзе 15 тысяч месц, прызначылі канцэрт знакамітай нямецкай групы Rammstein, кошт білетаў ад 80 да 300 тысяч рублёў.

## Ïàíàðàìà ¢íóòðûàáëàñíûõ ïàäçåé

***Віцебск.*** За 1 базавую велічыню летась у вобласці прадалі 151 аб'ект нерухомасці, больш, чым у іншых рэгіёнах краіны, было праведзена і 110 аўкцыёнаў, даход склаў 5,4 млрд.

***Наваполацк.*** Асноўнымі патэнцыйнымі пакупнікамі НПЗ "Нафтан" засталіся расійскія кампаніі "Раснафта" і "Лукойл", але РФ патрабе для сябе гарантый кантролю за ім.

***Віцебск.*** Летась у вобласці было найменей ДТЗ за апошнія 40 гадоў, усяго 781 здарэнне, аднак на дарогах загінулі 198 і яшчэ 780 чалавек атрымалі розныя траўмы і раненні.

***Верхнядзвінск.*** Фігурантамі крымінальнай справы сталі дырэктар масласырзавода і яго намесніца, якія за пару гадоў скралі на 75 млн. рублёў прадукцыі прадпрыемства.

***Віцебск.*** У сувязі з крызісам за год у Гаспадарчы суд вобласці паступіла 177 заяў аб прызнанні банкротства і ўпершыню 44 заявы райфінаддзелаў па вяртанню выданых ссуд.

***Мёры.*** На беразе возера ля дзіцячага санаторыя "Расінка" пабудавалі ў сасонніку тры шыкоўныя драўляныя домікі для аздараўлення тут і сем'яў з 3-5 чалавек у здраўніцы.

***Віцебск.*** У вобласці за апошнія 10 гадоў, як паказаў перапіс насельніцтва, найболей па Беларусі скарацілася колькасць яе жыхароў на 146 тысяч чалавек ( альбо на 10,6 %).

***Ушачы.*** Некалькі гадзін супрацоўнікі МНС шукалі ў заснежаным лесе 29-гадовага мужчыну з Полацка, які блукаў 5 км у гушчары і на шчасце меў з сабой мабільны тэлефон.

***Віцебск.*** Кандытарскі камбінат "Віцьба" стаў дыпламантам нацыянальнага конкурса за дасягненні ў галіне якасці 2009 года і атрымаў прэмію Урада Рэспублікі Беларусь.

***Верхнядзвінск.*** У недабудаваным будынку ў ваколіцах вёскі Чыстаполле пагранічнікі знайшлі ў бутэльцы з-пад шампанскага 300 мл ртуці, міліцыя пачала следства.

***Полацк.*** У якасці "Культурнай сталіцы Беларусі" 2010 года ў горадзе сёлета будуць паказаны канцэртныя праграмы міжнароднага фестываля "Славянскі базар у Віцебску".

***Орша.*** Па рашэнню суда 46-гадовы гараджанін выплаціць 4 млн. рублёў за адкусаную частку носа мужчыны, з якім ён высвятляў адносіны ў бойцы на падпітку каля кафэ.

***Глыбокае.*** Адораныя школьнікі края зноў былі аднымі з лепшых сярод сельскіх раёнаў па выніках абласнога этапа рэспубліканскай алімпіяды з удзелам больш 1100 вучняў.

***Полацк.*** Вядомы віцебскі мастак Фелікс Гумен падараваў мастацкай галерэі горада адразу 48 сваіх лепшых карцін акварэлі, якія склалі аснову яго новай выставы работ тут.

***Віцебск.*** У 25-ы раз у горадзе прайшоў міжнародны турнір па спартыўных бальных танцах "Віцебская сняжынка" з удзелам каля 500 зорных пар з больш чым 10 краін свету.

Служба інфармацыі "ВГ".

## Лічба нумара

**1,5** ***трлн. рублёў*** такая склалася, як адзначалася на апошнім пасяджэнні калегіі Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры Беларусі, дзбіторская запазычанасць толькі айчынных прадпрыемстваў будматэрыялаў. У даўгавой яме апынуліся і асноўныя беларускія цэментныя заводы, якія адгрузілі, але не атрымалі грошай за сваю прадукцыю на гігантскую суму, каля 1 трыльёна BYR. Але ж заводы не банкі, каб так адзейнічаць. У шэрагу абласцей перад вытворцамі пратэрмінаваныя плацяжы працягласцю да 2-х гадоў, але бяруць прадукцыю далей у доўг, бо трэба неяк выконваць прагнозныя паказчыкі.

На такім фоне ўжо не так радуюць мільёны здадзеных метраў жылля, бо ў гэтай галіне ўжо створана па-сутнасці цэлая фінансавая піраміда. Беларусам абяцалі, што будаўнічая галіна быццам лакаматыў выцягне айчынную эканоміку з крызіса. Але які гэта цягнік, калі ён падтрымліваецца з дзяржбюджэту, у якога цяпер багата прарэхаў і яшчэ летась быў уведзены рэжым жорсткай эканоміі расходаў. Наогул, 2010 год пачаўся з шэрагу спрэчак з Расіяй па пастаўках нафты, саюзнікі ніяк не маглі падпісаць пагадненне па пытанню транзіту электраэнергіі праз беларускую тэрыторыю, канцэрн "Газпрам" мырыць яшчэ больш павялічыць цэны на газ.

У выніку пакуль па мінімуму павялічыліся ў нас рознічныя цэны на паліва на запраўках, а гадавую інфляцыю загадана вытрымаць на ўзроўні 8-10%. Увогуле самая вялікая загадка бягучага года, як краіна будзе завяршаць чарговую сваю пяцігодку і павышаны ў сувязі з гэтым прагноз развіцця. Як-ніяк рост ВУП не пабаяліся давесці да паказчыкаў 11-13 %, рост экспарту амаль на трэць і зарплату працоўных у межах 1,5 млн. рублёў! У сувязі з гэтым толькі на Віцебшчыне загадваюць павысіць прадукцыйнасць працы ў 1,5 разы.

Прадпрыемствы вобласці павінны павялічыць выпуск прадукцыі адразу на 125 %, куды нам да тых жа кітайцаў. І працаваць ім загадана не на склад, а на сусветны рынак, а яшчэ адкрыць 100 новых вытворчасцей і столькі ж аб'ектаў прыдарожнага сервісу. Хлебаробам "пашчасціла" яшчэ болей, ім трэба сабраць ужо 1,5 млн. тон зерня. Эканамічны крызіс летась высветліў слабыя месцы многіх краін, але атрымоўваецца, што беларусаў нічому не вучыць.

Да прыкладу, адна з галоўных раней галін эканомікі машынабудаванне і металаапрацоўка ўпала да ўзроўню 74,3 % дакрызіснага 2008 года. Больш чым у 2 разы паменшыўся экспарт аднаго з галоўных прадпрыемстваў краіны "Беларуськалій", валюты зарабілі меней у 3 разы. Таксама ўпалі даходы ад нафтаперапрацоўкі, вытворчасць беларускіх трактараў, грузавікоў, тэлевізараў, станкоў, камбайнаў скарацілася на палову і болей. Гадзіннікавы завод "Прамень" яшчэ жывы, бо гадзіннікаў прыпасена наперад роўна на 3 гады працы.

У любой іншай краіне такую вытворчасць даўно б закрылі, перапрафіліравалі альбо прадалі замежнаму інвестару. У нас гадамі шукаюць выйсце і, шчыра кажучы, прывучылі людзей, што дзяржава для іх будзе доўга заставацца сабесам. Па шчырасці, многія беларускія тавары Еўропе і іншым кантынентам свету асабліва не патрэбныя, там вялікая канкурэнцыя цаны і якасці і дэфіцыту ў крамах нават у Расіі няма. Незразумела, на аснове якога аналізу, якіх канкрэтных лічб і разлікаў, з дапамогай чаго нейкім цудам у 2010 годзе тавары з маркай "Made in Belarus" патокам атрымаюць доступ хоць бы да дзяржзакупак у Расіі.

Нават у самай рэфармаванай галіне вытворчасці піва ў Беларусі чакаецца ў канцы года не рост, а яе падзенне з-за павелічэння акцызаў, стаўкі ПДВ з 18 да 20 % і ўводзімых забарон на распіццё пеннага напою ў грамадскіх месцах. Айчынныя піўвары сваю пяцігодку (выпуск 50 млн. дал) праграмы развіцця да 2010 года відавочна не выканаюць, хоць там у нас на рынку прысутнічаюць сусветнавядомыя кампаніі-лідэры, а дзяржаўным застаўся толькі піўзавод "Крыніца".

Асаблівасць беларускай нацыі, што яна доўга думае, баіцца перамен, жыве традыцыямі мінулага. У сённяшніх умовах цяперашнія амбіцыйныя планы развіцця могуць не спраўдзіцца па знакамітай прымаўцы: хацелі, як лепей, а выйшла ...

Ã³ñòîðûÿ áîëüøàñö³ ìà¸íòêà¢ ó âàêîë³öàõ Ãëûáî-êàãà íàë³÷âàå íå ìåíø ÷àòûðîõ ñòàãîääçÿ¢. Ìîæíà, ïðû æàäàíí³, ïàêîðïàööà ¢ ðîçíûõ äàâåäí³êàõ ³ âû-âåñö³ ã³ñòîðûþ, íàïðûêëàä, Ðàäçþêî¢, ç ÕV²² ñòàãîä-äçÿ. Àäíàê, ãýòà íå ¸ñöü òýìàé íàøàãà àïàâÿäàííÿ. Íàøàÿ òýìà – Ðàäçþê³ Áàðî¢ñê³õ. Ìàòýðûÿëû äàñëàëà íàøàÿ ÷ûòà÷êà, êîë³øíÿÿ ãëûáà÷àíêà, Ëþäì³ëà ²îñ-³ôà¢íà Àðäûíñêàÿ, ÿêàÿ ïðàæûâàå ¢ Ðàäçþêàõ.

Íåêàë³ Ðàäçþê³ íàëåæàë³ ¢ëàäàëüí³êàì Ìîñàðà ãðàôàì Áåðàñòî¢ñê³ì. Àíòîí Áàðî¢ñê³ (1760-1825) ó 1825 ãîäçå íàáû¢ Ðàäçþê³ ¢ Áåðàñòî¢ñê³õ (Brzostowskich).

Ðîçíûÿ êðûí³öû íàçûâàþöü äàòó Ðàäçþêî¢. Íà-ïðûêëàä, âûäàäçåíû ¢ 1930 ãîäçå, ¢ Ãëûáîê³ì, «Äà-âåäí³ê Äç³ñíåíñêàãà ïàâåòó», óêàçâàå, øòî ¢ ìà¸íòêó Ðàäçþê³- ² Øàðêî¢ø÷ûíñêàé ãì³íû íàë³÷âàëàñÿ 34 ÷àëàâåê³, çÿìë³ – 107 äçåñÿö³í. Ó ìà¸íòêó Ðàäçþê³ - ²², àäïàâåäíà, ëþäçåé – 48, çÿìë³ – 153 äçåñÿö³íû.

Â¸ñê³ Ðàäçþê³ äà 1939 ãîäà íå ³ñíàâàëà! Ã³ñòîðûÿ Ðàäçþêî¢, ãýòà – ã³ñòîðûÿ ìà¸íòêà¢ Ðàäçþê³- ² ³ Ðàä-çþê³ - ²².

Ñ¸ííÿ àá êîë³øí³õ ìà¸íòêàõ ó Ðàäçþêàõ íàãàäâà-þöü õ³áà øòî ðýäê³ÿ ñòàðûÿ ë³ïû äà êîë³øí³õ ïàðêà-âûõ ïðûñàäà¢, âàäçÿíû ìëûí, ³ 120-ãàäîâû äóá, ÿê³ ïàñàäæàíû ¢ ãîíàð íàðàäæýííÿ Âàöëàâà Áàðî¢ñêà-ãà, áóäó÷àãà ïðàôåñàðà Â³ëåíñêàãà ¢í³âåðñ³òýòà.

Ìû ì³íàåì ñ¸ííÿ ïðûãîæûÿ, å¢ðàïåéñêàãà âûãëÿ-äó Ðàäçþê³ ³ íå çàäóìâàåìñÿ í³êîë³, øòî òóò íàðàäç-³ëàñÿ øìàò âÿäîìûõ ëþäçåé ç ðîäó Áàðî¢ñê³õ, ÿê³ÿ ïàê³íóë³ ñâîé àäìåòíû ñëåä ó ã³ñòîðû³. Ñâàåòû, ðóé-íóþ÷û ðàäçþêî¢ñê³ÿ ñÿäç³áû, í³áûòà, çí³ø÷àë³ ïà-ìÿöü àá ïàíàõ-êðûâàñìîêàõ, à çí³ø÷ûë³ ïàìÿöü àá âåëüì³ ïðûñòîéíûõ ³ àäóêàâàíûõ ëþäçÿõ, ÿê³ì³ Ðàä-çþê³ ìàãë³ á ãàíàðûööà ïàêóëü ¸ñöü ãýòû ñâåò.

À¢òàð ãýòûõ ðàäêî¢, íà ïðàâå ðýäàêòàðà, ïàë³÷û¢ ïàòðýáíûì äàïî¢í³öü ìàòýðûÿëû øàíî¢íàé ñïàäà-ðûí³ Ëþäì³ëû æûööÿï³ñàì³ íåêàòîðûõ ñëûííûõ óðàäæýíöà¢ Ðàäçþêî¢.

*Уладзімір Скрабатун.*

■ **Людміла Ардынская,**
*в. Радзюкі, Шаркоўшчынскі раён.*

**Уздоўж Бярозаўкі-ракі -– вёска з назвай Радзюкі.
Плавалі ў лодках радзюкоўцаў продкі,
Ля старога млына берагі ў ляшчыне,
Густа хмель уецца па вольхах, ажыне,
Ёсць алеі й пляцы панскіх тых палацаў,
Што далі пачатак радзюкоўскім хатам.**

# РАДЗЮКІ

## Вяртанне да вытокаў

**Уладальнікі маёнтка Радзюкі- ІІ. Вацлаў Бароўскі (1888-1961), прафесар, педагог і яго жонка Браніслава Грабоўская.**

Багатая, цікавая і шматгадовая гісторыя ў вёскі Радзюкі, што ў Шаркоўшчынскім раёне. Старая Шаркоўшчына і навакольныя землі належылі роду магнатаў Сапегаў. Дата ўзнікнення маёнтка Радзюкі пазначаная 1856 годам, калі ўладаром вялікай плошчы і лесу каля 500 гектараў становіцца пан Бароўскі. Пачынаецца росквіт маёнтка. У школьным краязнаўча-этнаграфічным музеі вёскі Радзюкі сабраны багаты матэрыял аб яе гісторыі. Ён сведчыць аб тым, што з цягам часу ў маёнтку распачалося будаўніцтва вялікага драўлянага млына пад кіраўніцтвам інжынера-немца. Два памольныя камяні-жорны прыводзіліся ў рух вадой Бярозаўкі, дзеля чаго была пабудаваная плаціна, рэшткі якой захаваліся да нашага часу. Выраблялася вальцоўка і ячменныя крупы-панцак. У вайну партызаны спалілі млын, але ён быў адноўлены з цэглы.Вось каменная арка, праз якую вада вярталася ў раку, выглядае так, якой пабудавалі ў тыя далёкія гады. Канал даўжынёй 20 метраў ад аркі злучаецца з ракой.

Быў закладзены 7-гектарны сад, абсаджаны алеямі з ліпаў, бярозаў і клёнаў, ляшчыны. З-за мяжы прывозілі розныя экзатычныя расліны, было шмат розных кветак і дэкаратыўных кустоў. Жыхары Радзюкоў нават сярэдняга ўзросту ўзгадваюць, што яшчэ доўга самі па сабе яны раслі каля былых будынкаў, частка загінула, частка “перасялілася” у сялянскія агародчыкі.

Будаваліся мосцікі, пад'язныя шляхі, гаспадарчыя пабудовы, хаціны для запашнікаў, парабкаў. Да першай сусветнай вайны (1914 г.) уладальнікі маёнтка Радзюкі Бароўскія ў суполцы з гаспадарамі суседніх маёнткаў вырашылі пытанне аб будаўніцтве дарогі ад Шаркоўшчыны на Мосар праз маёнтак Радзюкі, фальварак Букі і Савуткі. Будаўніцтва спынілася каля Букаў – пачалася Першая сусветная вайна.

На пачатку ХХ стагоддзя ўздоўж Бярозаўкі ў невялікай адлегласці адна ад другой узніклі яшчэ тры пабудовы, якія належылі дзвюм дачкам і сыну Вацлаву, які пэўны час выкладаў у Віленскім універсітэце, і ў гонар нараджэння якога ў 1888 годзе, бацька, пан Бароўскі, пасадзіў дуб. Дрэва і цяпер расце, яму ўжо 120 гадоў. Разгалісты і каржакаваты з абрубкамі адсечаных сукоў. Да 1939 года

*Працяг на стар. 5*

**Пры ўездзе ў в. Радзюкі з боку Глыбокага.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010.*

**На месцы сядзібнага дома Бароўскіх у Радзюках пабудаваная саўгасная кантора.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010.*

Ýäâàðä Áàðî¢ñê³

**Ýäâàðä Áàðî¢ñê³ (1818-1897), ñûí Àíòîíà (1760-1825). Ïàëêî¢í³ê Ðàñ³éñêàé Àðì³³. Æûõàð àäíîé ç ÷àñòàê Ðàäçþêî¢. Ïàä ÷àñ Êðûìñêàé âàéíû 1853 – 1856 ãã, áû¢ àäçíà÷àíû çàáàðîíó Ñåâàñòîïàëÿ. Çàïðàÿ¢ëåíóþ ìóæíàñöü, ÿêàÿ àêóïëåíàÿ ðàíàì³, àòðûìà¢ÿñíåâåóþ ëÿñêó ñàñðýáíàé ãàëàâîé ç ³íêðóñòàöûÿì³ ³öàðñêàãà äàçâàëåííÿ íà¢æûâàííå ÿåäàìóíäç³ðà.**

Ãæýãàæ Áàðî¢ñê³

**Ãæýãàæ Áàðî¢ñê³ (1856-1918), ³íæûíåð-ìåõàí³ê, ïàëêî¢í³ê Ðàñ³éñêàé àðì³³. Ñûí Ýäâàðäà, ðàñ³éñêàãà ïàëêî¢í³êà (áðàòà Êàñïåðà³ Êàç³ì³ðà). Íàðàäç³¢ñÿ ¢ ðàäàâûì ìà¸íòêó Ðàäçþê³, Äç³ñíåíñêàãà ïàâåòó. Ñÿðýäíþþ àäóêàöûþ àòðûìà¢ó êîðïóñå ìàðñê³õ êàäýòà¢; ó 1874-76 ãã çäçåéñí³¢ ïàäàðîææà âàêîë ñâåòó ïàä âåòðàçÿì³ íà âó÷ýáíûì êàðàáë³. Ó äàëåéøûì ïàñòóï³¢ ó Ìàðñêóþ ³íæûíåðíóþ âó÷ýëüíþ ¢ Êðàíøòàäöå, ÿêóþ ñêîí÷û¢ çïðàôåñ³ÿé ôëîöêàãà ³íæûíåðà-ìåõàí³êà. Ïàñëÿ äàäàòêîâàé âó÷îáû ¢ Ôðàíöû³ ³ Àíãë³³ ¢ñòóïà¢ íà ðàñ³éñêóþ äçÿðæàâóþ ñëóæáó. Êàðûñòà¢ñÿ ïàâàãàé ó Ïåöÿðáóðãó. Óäàñêàíàë³¢ âûíàõîäí³öòâû ³ ðàñïðàöî¢êå³¢ ãàë³íå ïàáóäîâû ïàðàâûõ êàòëî¢. Âûäà¢íàâóêîâàå äàñëåäàâàííå ïàä íàçâàé “Âîäàòðóáíûÿ êîòë¸ ñèñòýìû èíæåíåðà Ã. Áîðîâñêîãî”, Ïåò., 1915 ã.**

Герб «Ястрабец», да якога належыў шляхецкі род Бароўскіх.

# РАДЗЮКІ

## Вартанне да вытокаў

*Працяг са стар. 4*

сын старога пана Вацлаў Бароўскі з жонкай і маленькімі дзецьмі прыязджаў з Вільні ў маёнтак летам у час вакацый. Дочкі ўзялі шлюб з высокапастаўленымі асобамі і жылі таксама ў Вільні. Зямля здавалася ў арэнду. У гэты час у Радзюках жыло ўжо трыццаць дзевяць душ насельніцтва: арандатары, млынары, запашнікі, эканом.

Пасля 17 верасня 1939 года ў старым маёнтку была адкрытая хата-чытальня, клуб, дзе збіралася сялянская моладзь. У хуткім часе будынак быў знесены, а на яго падмурку пабудавана кантора саўгаса імя Маркава. Астатнія панскія пабудовы былі разабраныя, іх вывезлі ў Шаркоўшчыну. Да нашага часу захаваўся адзін будынак, які належыў дачцэ старога пана Гелене, у пасаг яна атрымала таксама і млын.

Памятаюць і захоўваюць сваю гісторыю радзюкоўцы. Не было б тых панскіх маёнткаў, не было б, магчыма, і вёскі Радзюкі, якая разбудавалася на другім баку шашы Глыбокае-Шаркоўшчына і налічвае каля паўтысячы жыхароў. Уздоўж Бярозаўкі ад старой панскай сядзібы ў напрамку на Глыбокае пабудаваныя чатыры катэджы і новая вуліца з чатырнаццаці дамоў з назваю Садовая.

Жывуць на радзюкоўскай зямлі праўнукі і нават дзеці тых запашнікаў, млынароў, парабкаў, прадаўжаюць свой род.

**Будавалі хаты продкаў**
**тых нашчадкі.**
**Спадары выдатныя, на**
**ўсе справы здатныя.**
**Увесь дзень працуюць,**
**часу не марнуюць,**
**Дарма не губляюць,**
**хлеб і да хлеба маюць.**

Цікава і змястоўна распавядаюць аб мінуўшчыне Надзея Лазовік, дачка таго самага млынара паноў Бароўскіх і Аліна Чорная, маці якой прыслужвала ў панскіх пакоях. Абедзвюм жанчынам ужо далёка за восемдзесят. На гэтым гісторыя Радзюкоў магла б і скончыцца, але, як кажуць, свет не бывае без цудаў.

Вестка хутка разнеслася па вёсцы: "Паны былыя прыехалі на радзіму!" І сапраўды, праз семдзесят гадоў сын таго віленскага прафесара Вацлава Бароўскага Эдвард разам з сынам, жонкай, пляменнікамі прыехалі на радзіму сваіх дзядоў і прадзедаў. Прывёў Эдвард Бароўскі сваю сям'ю да млына, да ракі Бярозаўкі, выпадкова сустрэў тую жанчыну, якая жыве ў доме яго цёткі Гелены. Яна параіла сустрэцца з Надзеяй Лазовік, якая памятае падзеі даўніны. Сустрэча адбылася, прыйшла і Аліна Чорная. Сапраўды звілістыя і пакручастыя шляхі чалавечага лёсу. У маленстве разам купаліся ў Бярозаўцы, грэліся на пясчаным беразе пад адным сонцам: панічы і сялянскія дзеці.

За сотні кіламетраў з Польшчы, з Гданьска, чалавек прыехаў на радзіму, каб хоць пастаяць на тым месцы, дзе была сядзіба дзеда й бацькі, пачуць плёскат хваляў Бярозаўкі, пабачыць дуб, пасаджаны дзедам, узяць з сабой жменьку роднай зямлі.

Ён не разлічваў на сустрэчу са знаёмымі, не чакаў, што хтосьці будзе з ім размаўляць. А здарылася ўсё наадварот, такі ўжо менталітэт беларусаў, народа памяркоўнага, гасціннага, спагадлівага, з дабрынёй у

*Заканчэнне на стар. 6*

**в. Радзюкі. Дуб у колішнім маёнтку, які пасаджаны ў 1888 годзе з нагоды нараджэння Вацлава Бароўскага.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010 г.*

**в. Радзюкі. Млын у колішнім маёнтку Бароўскіх. Верхняя драўляная частка – спаленая партызанамі ў апошнюю вайну. Пасля вайны адбудаваная ў цэгле. Ніжняя, змураваная з камянёў, аўтэнтычная.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010.*

**в. Радзюкі. Унутры пакінутага і разрабаванага млына Бароўскіх. Некалі тут быў усталяваны генератар, які прадукаваў электрычны ток.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010.*

**Ï ðàöóþ÷û äàë¸êà àä ðàäç³ìû, í åï àðû âà¢ ñóâÿçÿ¢ ç ¸é, ç Ðàäçþêàì ³. Ï àø û ðû ¢ ì à¸í òàê ³ ¢äàñê àí àë³¢ ñâàë üñê óþ ãàñï àäàðêó, ï àáóäàâàâà¢ì ëûí . ß ãî ñòàðàí í ÿì ³ ï à¢ñòàëà ï åðø àÿ áðóê àâàí êà çàì ³æ äðà¢ëÿí àãà í àñö³ëó êàëÿ êàï ë³öû Ì àö³ Áî æàé Âàñòðàáðàì ñêàé ¢ Â³ëüí ³. Ï àì ¸ð ó Ï åöÿðáóðãó, äçå ÿãî çàñï å¢ áàëüø àâ³öê ³ ï åðàâàðî ò.**

Ñåâÿðû í Áàðî¢ñê³

**Ñåâÿðû í Áàðî¢ñê³ (1863 – 1935). Ñû í Ýäâàðäà, ðàñ³éñêàãà ï àëêî¢í ³êà (áðàòà Êàñï åðà ³ Êàç³ì ³ðà). Í àðàäç³¢ñÿ ¢ ðàäàâû ì ì à¸í òêó** Ðàäçþê³**, Äç³ñí åí ñêàãà ï àâåòó. Áðàò Ãæýãàæà Áàðî¢ñêàãà. ²í æû í åð-ì åõàí ³ê, ðàñ³éñê³ ãåí åðàë. Àäóêàöû þ àòðû ì à¢ òóþ æ, ø òî ³ áðàò Ãæýãàæ. Çàçåéí ³¢ ï àäàðî ææà âàêî ë ñâåòó. Ï àçí åé áû ¢ ³í æû í åðàì - ì åõàí ³êàì í à âàåí í à-ì àðñê³õ êàðàáëÿõ. Ï àä ÷àñ ðàñ³éñêà-ÿï î í ñêàé âàéí û , ó á³òâå ï àä Öóñ³ì àé, áà÷à÷û í åï àçáåæí àñöü êàï ³òóëÿöû ³ ¢ ñóâÿç³ ç àáñòðýëàì ÿï î í öàì ³ áðàí ÿí î ñöà "Ñû ñî é Âåëèêèé», í à ÿê³ì çí àõî äç³¢ñÿ Ñ. Áàðî¢ñê³, àäì î â³¢ñÿ àä âû ðàòàâàí í ÿ ³ çàòàï ³¢ êàðàáëü. Ó àñòàòí ³ÿ õâ³ë³í û ¢ðàòàâàë³ ÿãî óñ¸ æ ÿï î í öû , óçÿ¢ø û ¢ ï àëî í . Ï àñëÿ òî é âàéí û Ñ. Áàðî¢ñê³ ï ðàöàâà¢ äçÿðæà¢í û ì êàí òðàëåðàì ï ðû áóäà¢í ³öòâå êàðàáë¸¢ó Ì ³êàëàåâå. Ï àçí åé ÿê ï åí ñ³ÿí àâàí û ãåí åðàë àñåë¢ ó ì à¸í òêó æî í ê³ Þ çýô³ âà Áðàñëà¢ñêàãà ï àâåòó, äçå ³ ï àì ¸ð ó 1935 ãî äçå.**

Ýäâàðä Áàðî¢ñê³

**Эдвард Бароўскі, нарадзіўся ў 1925 годзе ў** Ðàäçþêàõ**. Сын Вацлава Бароўскага (1888-1961). Прафесар біяхіміі. Пражывае ў Гданьску (Польшча). Летась разам з сынам, жонкай, пляменнікамі прыязджаў на радзіму сваіх дзядоў і прадзедаў – Радзюкі.**

# РАДЗЮКІ
## Вяртанне да вытокаў

**Заканчэнне.**
***Пачатак на стар. 4,5.***

сэрцах людскіх.

Менавіта так сустрэла нашых гасцей з Польшчы сям'я старэйшай жыхаркі Радзюкоў Надзеі Лазовік. Дачка Рэгіна, сын Мікалай, унучка Таццяна, праўнучка Аня, прынялі самы непасрэдны ўдзел у гэтай сустрэчы. Калі пан Эдвард прадставіўся, Надзея Лазовік успомніла таго хлопчыка, з якім яна і яе браты бегалі каля млына, гулялі каля ліпаў на другім беразе ракі, якія цяпер састарэлі, як і яны, але захаваліся, жывуць.

Колькі было ўспамінаў і размоваў за кубачкам кавы і гарбаты! Дый не толькі – стол быў вельмі багаты на пачастункі, што вельмі здзівіла гасцей. Чужыя людзі наладзілі ім такі цёплы, сардэчны, шчыры і шчодры прыём.

Аліна Чорная прынесла старую зжаўцелую фотакартку, на якой Эдвард Бароўскі – у юнацтве. Радасці не было канца. Госці абяцалі прыехаць у наступным годзе, шмат фатаграфаваліся.

На памяць пан Бароўскі папрасіў Мікалая, сына гасціннай спадарыні Надзеі, выкапаць кусцік ляшчыны з роднага берага. Доўга стаяў на мосце ракі Бярозаўкі, гледзеў на яе павольную плынь і казаў: «Ведаеце, я не спадзяваўся, што калі-небудзь пабачу Бярозаўку і пачую, як плёскаюць яе хвалі». Чалавек размаўляў у думках з роднымі мясцінамі. І мне падалося, што яна вялася так: стары ссівелы чалавек, якому ўжо дзевяты дзесятак вітаўся і адначасова развітваўся з роднай зямлёй, памяць аб якой пранёс праз усё жыццё:

**– Цябе доўга не бачыў,**
**Бярозаўка.**
**Прывітанне табе,**
**родны бераг!**
**Хвалі пеняцца, б'юцца**
**ў трывозе,**
**Калыхаюць качак у**
**аеры.**
**– Жыву ў Гданьску, быў**
**у Кракаве, Познані,**
**Але сніліся родныя**
**далі.**
**– Ты прыйшоў? А чаму**
**так запознена?**
**Трыснягі і чарот**
**зашапталі.**

Але прыйшоў чалавек, вярнуўся да сваіх вытокаў разам з нашчадкамі, каб маглі распавесці сваім дзецям, адкуль яны і хто яны. Бо самае найвялікшае багацце на зямлі – гэта зямля бацькоў, менавіта яна – радзіма, а не тая, дзе жывеш потым і да якой прызвычайваешся.

Здаецца, надвор'е спрыяла прыезду пана Эдварда Бароўскага на радзіму. У той дзень, калі ён вітаўся з Бярозаўкай, у небе над Радзюкамі з'явіліся буслы, іх было шмат. Відаць збіраліся ў вырай. Відовішча было вельмі прыгожае: буслы зрабілі два развітальных кругі над вёскай, у вольным палёце без узмахаў крылаў луналі ў паветры. Белыя птушкі кружылі, развіталіся з роднымі прасторамі і людзьмі, быццам адчуваючы цяпло шчырых людскіх сэрцаў.

Развітваўся з роднымі мясцінамі і пан Бароўскі. Дай Бог, не ў апошні раз! Сям'я Надзеі Лазовік праводзіла гасцей з Польшчы да мікраaўтобуса, сардэчна запрашала прыязджаць і не спыняцца ў гасцініцы, хоць і там, у Глыбокім, іх сустрэлі вельмі добразычліва.

Семдзесят гадоў – вялікі прамежак часу. Шмат зменаў адбылося на радзіме пана Бароўскага. Вядома ж, ён не пазнаў гэтыя новыя Радзюкі, якія набылі статус аграгарадка з гандлёвым цэнтрам, спартыўным комплексам, новым ФАПам, новымі прыгожымі вуліцамі. А сэрцы людскія засталіся, як і раней, адкрытыя і шчырыя, як і ў Надзеі Лазовік, былога вязня канцлагеру ў Франкфурце-на-Майне:

**Дзевяты дзесятак, а**
**людзі ідуць у хату.**
**Мае міласэрнасць, у**
**чалавека верыць.**
**І бездапаможным**
**чымсьці дый паможа.**
**А то й дасць прытулак,**
**не зачыніць дзверы.**
**Вось на справе вера!**
**Кошт жыццю пазнала, ніштo не зламала.**
**Ласку не забудуць, дзякуюць ёй людзі.**

Лістапад, 2009 г.

**в. Радзюкі. Гандлёвы і культурны цэнтр, якія размешчаны каля аўтадарогі Глыбокае-Шаркоўшчына.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010 г.*

**З правага боку будынка млына засталося начынне ад колішняй пілорамы.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010 г.*

**Сёння Разюкі выглядаюць досыць па-еўрапейску. Не сорамна перад прыбалтамі, дзесяткі аўтамашын якіх, штодня, мінаюць Радзюкі па аўтадарозе Браслаў-Шаркоўшчына-Глыбокае. У расіянаў такое відовішча выклікае непрыхаваную зайздрасць.** *Фота Ул. Скрабатуна, 31.01.2010 г.*

# Êàá ç ýëåêòðààáàãðàâàííåì íå áûëî ïðàáëåì

**А.Н.Ішуцін,**
*інспектар Глыбоцкага МРА Энерганагляду.*

З наступам зімовых халадоў па вялічваецца колькасць выпадкаў выкарыстання электрычнай энергіі для абагравання і ацяплення. Даволі часта пры гэтым не выконваюцца элементарныя патрабаванні бяспекі, мантаж і падключэнне электранагравальных прыбораў выконваецца з парушэннямі, ужываюцца самаробныя электранагравальныя прылады, што можа прывесці да пажару або няшчаснаму выпадку. Так, напрыклад, ужыванне самаробнага электраабагравальніка з пашкоджанай ізаляцыяй для абагрэву вартавога памяшкання каштавала жыцця начному скотніку СПК "Бальшавік -Агра" Салігорскага раёна.

Каб пры эксплуатацыі электранагравальнага абсталявання не ўзнікалі падобныя сітуацыі, неабходна выконваць наступныя меры бяспекі:

● ужыванне электрычнай энергіі для ацяплення і нагрэву ў юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў магчыма толькі пры наяўнасці заключэння органа Дзяржэнерганагляду.

● катэгарычна забараняецца ўжыванне электрычных катлоў і іншых электранагравальных прыбораў саматужнага вырабу.

● марка электраабагравальнікаў, спосаб іх падключэння, выбар апаратаў аховы вызначаюцца праектам. Эфектыўнай абаронай ад паражэння электрычным токам пры выпадковым дакрананні з'яўляецца ўжыванне прылад ахоўнага адключэння (ПАА) з токам спрацоўвання да 30 мА.

● электрамантажные работы павінны выконвацца кваліфікаванымі электрыкамі паводле праекту і патрабаванняў нарматыўных дакументаў.

● падключэнне электранагравальных прылад праводзіцца пасля допуску ў эксплуатацыю інспектарам Энерганагляду.

● пры эксплуатацыі электранагравальных прыбораў неабходна строга выконваць патрабаванні інструкцый заводаў-вытворцаў.

● у працэсе эксплуатацыі неабходна сачыць за тэхнічным станам электранагравальнага абсталявання, апаратаў аховы, ланцугоў занулення і зазямлення, электраправодак, своечасова выконваць неабходныя прафілактычныя і рамонтныя працы, аператыўна ўхіляць няспраўнасці, якія ўзнікаюць.

Кансультацыю па правільным падключэнні электранагравальнага абсталявання можна атрымаць у інспекцыі Дзяржэнерганагляду.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ "Вольнага Глыбокага"

8 – 14 лютага 2010 г.



## ПАНЯДЗЕЛАК, 8 лютага

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Новости.
**06.05, 07.10, 08.15** «Доброе утро,Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Деловая жизнь.
**08.30** В мире моторов.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** Здоровье.
**10.05** Женское ток-шоу «Жизнь как жизнь». «Я не боюсь делать карьеру».
**11.00 «Не родись красивой»**
**12.10 «Гарри Поттер и философский камень»**
**14.30** «Іван Мележ. Туманы над багнаю».
**15.15, 19.15** Новости региона.
**15.25** Хроникально-документальный цикл «Горячие точки»
**15.55** Культурные люди.
**16.25** Мелодрама **«Сестры по крови»** (Россия-Украина).
**17.20 «Не родись красивой»**
**18.25** Видеофильм АТН
**18.50, 00.40** «Зона Х».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арена».
**19.55** Ток-шоу «Ответный ход».
**21.00** Панорама.
**21.55** Специальный репортаж АТН «Освенцим. 2010».
**22.10** Мистический триллер **«Пророк»**
**23.50 «Части тела-5»**
**00.45** День спорта.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Наши новости.
**06.05** ОНТ представляет: «Наше утро».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыхание планеты».
**10.45** «Великолепная пятерка».
**11.00** Наши новости.
**11.05** Новости спорта.
**11.10** ОНТ представляет: «Великолепная пятерка».
**12.00** «Малахов+».
**13.00** Наши новости.
**13.05** Новости спорта.
**13.10** «Понять. Простить».
**13.40** «Модный приговор».
**14.45** «Контрольная закупка».
**15.15 «Любительница частного сыска Даша Васильева»**.
**16.00** Наши новости.
**16.10** Новости спорта.
**16.15 «Монтекристо»**.
**18.00** Наши новости.
**18.15** Новости спорта.
**18.20 «Моя прекрасная няня»**.
**19.05** Жди меня.
**20.00** Время.
**20.30** Наши новости.
**21.00** Новости спорта.
**21.05** Ток-шоу «Выбор».
**22.00** Премьера. **«Остаться в живых»**. Многосерийн.фильм. IV сезон.3-я серия.
**23.00** Наши новости.
**23.15** Новости спорта.
**23.20** «Преступления века».
**23.50 «Женаты... с детьми»**. Многосерийн.фильм.
**00.35** Наши новости.
**00.50-01.00** Новости спорта.

**07.00** ЛАДное утро.
**08.00 «Универ»** (Россия).
**08.30** Час суда. Дела семейные.
**09.25** В этот день.
**09.30** Сериал **«Любовь как любовь»**
**10.35** Спортивная драма **«Скорость»**
**12.10** «Пра мастацтва».
**12.35** Школа ремонта.
**13.35** Мультсериал **«Семейка пиратов»**
**14.25** Внеклассный час.
**14.45** Бухта капитанов.
**15.20** Телебарометр.
**15.40** Детективный сериал **«Комиссар Мегрэ»**
**16.25** Час суда. Дела семейные.
**17.25** Простые упражнения
**18.00** Сериал **«Любовь как любовь»**
**19.00 «Ошибка резидента»** 1-я ч.
**20.30** «Калыханка».
**20.50** Белорусское времечко.
**21.50** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**22.45 «Универ»** (Россия).
**23.15** Детективный сериал **«Комиссар Мегрэ»**

**06.00** «24 часа».
**06.10** «Минщина».
**06.20** «Утро. Студия хорошего настроения».
**07.30** «24 часа».
**07.40** «СТВ-спорт».
**07.45** «Утро.Студия хорошего настроения».
**08.30** «Неделя».
**09.35** «Большой завтрак».
**10.05** «Пять историй».
**10.30** «24 часа».
**10.40** «Ангел-хранитель». Теленовелла.
**11.50** «Званый ужин».
**12.40 «Бывшая»**. Сериал.
**13.30** «24 часа».
**13.50** «Звездный ринг». Группа «Litesound» против группы «Новый Ариэль».
**15.05** «Дальние родственники».
**15.30** «Горячий лед».
**16.00** «Культурная жизнь» с Александром Ефремовым.
**16.30** «24 часа».
**16.50** «Я - путешественник».
**17.10** «Наше дело».
**17.20** «Минщина».
**17.30** «Званый ужин».
**18.30 «Бывшая»**. Сериал.
**19.30** «24 часа».
**20.00** «Столичные подробности».
**20.10** «СТВ-спорт».
**20.20** «Добрый вечер, малыш».
**20.40** «Кинопонедельник»: Федор Лавров и Елена Морозова в фильме **«МЫ ПОЖЕНИМСЯ, ИЛИ В КРАЙНЕМ СЛУЧАЕ СОЗВОНИМСЯ»**. Украина, 2008 г.
**22.30** «24 часа».
**22.55** «Столичные подробности».
**23.00** «Столичный футбол».
**23.30** «Громкое дело».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**17:10** Еўропа сёння
**17:40 «Арол: крымінальная сага»**, серыял, 4 серыя
**18:35** Госць «Белсату»
**19:00** Прэс-экспрэс
**19:20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі
**19:25 «Аблавушак»**, мультсерыял
**19:35** ПраСвет
**19:50** Жаўтуха
**20:15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Раскіданы дом» 1996 г., Польшча
**21:00** Аб'ектыў
**21:20** Фільматэка майстроў: **«Ад-магілы-да-магілы»**
**23:00** Аб'ектыў

## АЎТОРАК, 9 лютага

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Новости.
**06.05** День спорта.
**06.10, 07.10, 08.15** «Доброе утро, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Деловая жизнь.
**08.35** «Арена».
**09.05** Мелодраматический сериал **«И все-таки я люблю»**
**10.00** Мелодрама **«Сестры по крови»** (Россия-Украина).
**10.50 «Не родись красивой»**
**11.40** Специальный репортаж АТН «Освенцим. 2010».
**12.10** Премьера. Психологическая криминальная драма **«Жизнь взаймы»** 1-я и 2-я серии.
**14.05** Ток-шоу «Ответный ход».
**15.15, 19.15** Новости региона.
**15.25** Хроникально-документальный цикл «Эпоха». Николай Судзиловский-Руссель. Фильм 1-й.
**15.55** Семейная сага **«Ермоловы»**
**16.45** Мелодрама **«Сестры по крови»** (Россия-Украина).
**17.50 «Не родись красивой»**
**18.50, 00.35** «Зона Х». Криминальная хроника.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера интересов.
**19.55** Мелодраматический сериал **«И все-таки я люблю»**
**21.00** Панорама.
**21.55** Психологический детектив **«Бассейн»** (Франция-Великобритания).
**23.45 «Части тела-5»**
**00.45** День спорта.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Наши новости.
**06.05** ОНТ представляет: «Наше утро».
**09.05** Жди меня.
**10.05** «Игорь Матвиенко. Маэстро в джинсах».
**11.00** Наши новости.
**11.05** Новости спорта.
**11.10** ОНТ представляет: «Один против всех».
**12.00** «Малахов+».
**13.00** Наши новости.
**13.05** Новости спорта.
**13.10** «Понять. Простить».
**13.40** «Модный приговор».
**14.45** «Контрольная закупка».
**15.15 «Любительница частного сыска Даша Васильева»**. Многосерийный фильм.
**16.00** Наши новости.
**16.10** Новости спорта.
**16.15 «Монтекристо»**. Многосерийный фильм.
**17.10** «Пусть говорят» с Андреем Малаховым.
**18.00** Наши новости.
**18.15** Новости спорта.
**18.20** Сергей Жигунов, Анастасия Заворотнюк в комедийном сериале **«Моя прекрасная няня»**. Амедия (Россия) при участии Сони Пикчерс (США), 2004 год.
**19.00** Премьера. **«Слово женщине»**. Многосерийный фильм.
**20.00** Время.
**20.30** Наши новости.
**21.00** Новости спорта.
**21.05** Премьера. **«Крем»**. Многосерийный фильм.
**22.05** Премьера. **«Вербное воскресенье»**. Многосерийный фильм.
**23.10** Наши новости.
**23.25** Новости спорта.
**23.30** «Обратный отсчет». «Граница 45-го. Белостокский излом».
**00.00 «Женаты... с детьми»**. Многосерийн.фильм.
**00.45** Наши новости.
**01.00-01.10** Новости спорта.

**07.00** ЛАДное утро.
**08.00** Молодежный комедийный сериал **«Универ»** (Россия).
